По словам заместителя министра сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь Аллы Ломакиной, сейчас конъюнктура и баланс мирового продрынка остаются крайне нестабильными, изменилась международная логистика, кризисные явления наблюдаются в экономиках большинства стран. Поэтому поиск эффективных механизмов устойчивости агросистем – стратегически важное направление в госполитике в том числе и Беларуси.

Из-за пандемии COVID-19 на государственном уровне у нас принимались различные меры поддержки экономики. В аграрной политике для сохранения продовольственной безопасности реализован комплекс мер, что позволило агросектору в прошлом году обеспечить положительную динамику, увеличить производство сельскохозяйственной продукции и продуктов питания.

«В условиях снижения деловой активности актуально создание условий для эффективного функционирования сельхозпроизводителей с максимальным снижением бюджетной нагрузки, – акцентировала заместитель министра. – А для этого необходимы действенные механизмы, позволяющие стимулировать привлечение инвестиций в сельское хозяйство, страхование доходности, развитие предпринимательства на селе и т.д. Выработка таких мер невозможна без постоянного научного сопровождения, анализа международных практик, выработки стратегии развития. В этих направлениях Минсельхозпрод взаимодействует с аграрными структурами НАН Беларуси, включая Институт системных исследований в АПК. Вместе мы должны искать приоритетные пути, позволяющие обеспечить новое качество роста в отрасли, усилить позиции на продовольственных рынках».

Инна ГАРМЕЛЬ,
фото автора, «Навука»

В ЧЕСТЬ МИХАИЛА СЕВЕРНЕВА

На базе НПЦ НАН Беларуси по механизации сельского хозяйства 21–22 октября прошла международная конференция «Научно-технический прогресс в сельскохозяйственном производстве. В этом году ее посвятили 100-летию со дня рождения доктора технических наук, профессора, академика НАН Беларуси, ВАСХНИЛ и РАСХН Михаила Максимовича Севернева.

Инновации в механизации процессов производства растениеводческой и животноводческой продукции обсуждали ученые из Беларуси, России, Польши. «Умная» ферма, точное земледелие, возобновляемые источники энергии – вот лишь некоторые темы конференции.

Генеральный директор Центра Дмитрий Комлач рассказал об основных направлениях деятельности НПЦ на ближайшую перспективу.

С приветственным словом выступил заместитель Председателя Президиума НАН Беларуси Петр Казакевич, который отметил роль М. Севернева в аграрной науке.

В ходе научной части конференции большой интерес вызвал доклад доктора технических наук Владимира Дашкова «Роль академика М.М. Севернева в развитии белорусской аграрной науки» – с анализом вклада замечательного ученого-агрария в развитие современного сельского хозяйства и энергетики республики.



В других докладах подчеркивалась необходимость на нынешнем этапе автоматизации и роботизации технологических процессов в производстве сельскохозяйственной продукции.

Во второй день конференции ее участники выезжали на малую родину М. Севернева – в агрогородок Головчин Белыничского района, что на Могилевщине. Там посетили среднюю школу, где учился будущий академик, осмотрели музейную экспозицию.

Своими воспоминаниями об учителе поделились ученики М. Севернева – кандидаты технических наук Виктор Ловкис и Николай Капустин. О жизни и человеческих качествах замечательного ученого рассказала его племянница Татьяна Полобок (**на фото**).

Гости на память о теплой встрече оставили в Головчинской СШ подарки и сувениры.

Инна ГАРМЕЛЬ, «Навука»
Фото предоставлено НПЦ по механизации сельского хозяйства

Да 100-годдзя Інбелкульта

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ЛЕКСІКАГРАФІЯ: АД ІНБЕЛКУЛЬТА ДА СУЧАСНАСЦІ

20 кастрычніка ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі адбыўся круглы стол «100 гадоў беларускай нацыянальнай лексікаграфіі: ад Інбелкульта да сучаснасці», прымеркаваны да 100-годдзя Інстытута беларускай культуры і беларускай акадэмічнай навукі.

Мерапрыемства прайшло ў вочна-дыстанцыйным фармаце. У дыскусіі прынялі ўдзел вучоныя Інстытута мовазнаўства, выкладчыкі ВНУ, многія з прысутных скарысталіся магчымасцю далучыцца да пасяджэння анлайн.

Дырэктар інстытута Ігар Капылоў засяродзіў увагу прысутных на выбітных асобах. Так, у распрацоўцы статута Інбелкульта прыняў удзел выдатны вучоны філолаг і этнограф акадэмік Я.Ф. Карскі. Імёны правадзейных членаў Інбелкульта, вядомых беларускіх навукоўцаў і грамадскіх дзеячаў – Янкі Купалы, Якуба Коласа, Вацлава Ластоўскага, Язэпа Лёсіка – непарыўна звязаны з развіццём нацыянальнага мовазнаўства. За 6–7 год Інбелкульт паспяхова прайшоў складаны шлях, і ў выніку была створана Беларуская акадэмія навук, сёння гэта – Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Яе першым віцэ-прэзідэнтам і першым дырэктарам Інстытута мовазнаўства БАН быў прызначаны Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч – таленавіты вучоны і арганізатар беларускай навукі ў гуманітарнай сферы.

Важным этапам у развіцці нацыянальнай лексікаграфіі стала дзейнасць Слоўнікавай камісіі, якая функцыянавала ў складзе Інбелкульта: тут – вытокі стварэння дыялектных слоўнікаў, падрыхтаваны «Беларуска-расійскі слоўнік» (1926) і «Расійска-беларускі слоўнік» (1928), распрацавана канцэпцыя слоўніка жывой беларускай мовы.



Удзельнікі круглага стала распавялі пра асобу С. Некрашэвіча як кіраўніка Слоўнікавай камісіі Інбелкульта і яе дзейнасць па стварэнні «Слоўніка жывой беларускай мовы», ролі краязнаўчых арганізацый у лексікаграфічнай рабоце на пачатку XX стагоддзя, пераемнасці паміж слоўнікавымі выданнямі Інбелкульта і сучаснымі працамі ў галіне беларускай лексікаграфіі.

С. Некрашэвіч актыўна займаўся апрацоўкай беларускай навуковай тэрміналогіі па розных галінах ведаў (за перыяд з 1922 па 1930 г. апублікаваны 24 выпускі «Беларускай навуковай тэрміналогіі»), прымаў удзел у распрацоўцы канцэпцыі гістарычнага слоўніка, сумесна з М. Байковым з'яўляўся аўтарам-укладальнікам вядомых перакладных слоўнікаў.

У 1929 г. акадэмік С. Некрашэвіч узначаліў камісію па ўкладанні слоўніка жывой беларускай мовы – першага нацыянальнага выдання, якое павінна было максімальна шырока ахапіць лексіку беларускай мовы XIX – пачатку XX стагоддзя. На круглым стале былі падрабязна абмеркаваны канцэптуальныя лексікаграфічныя пытанні, звязаныя з укладаннем гэтага слоўніка. Дзякуючы апублікаванаму ў 1925 годзе ў часопісе «Полымя» дакладу, які быў прачытаны на сходзе мовазнаўчай секцыі, мы можам сёння меркаваць пра навуковую канцэпцыю слоўніка, яго лексікаграфічную спецыфіку. Так, у канцэпцыі былі вызначаны храналагічныя межы слоўніка, яго лексічны склад, які ўключаў тры асноўныя крыніцы лексічнага матэрыялу (народная мова, літаратурная мова, тэрміналогія), былі распрацаваны метады збірання і апрацоўкі дыялектных слоў. На падрыхтоўчым этапе стварэння слоўніка жывой беларускай мовы найбольш прадуктыўным стала ўкладанне рэгіянальных, ці краёвых, як тады іх называлі, слоўнікаў. У сувязі з гэтым актывізаваўся краязнаўчы рух, да лексікаграфічнай работы падключыліся шматлікія краязнаўчыя арганізацыі, якія прынялі актыўны ўдзел у стварэнні картатэкі для слоўніка жывой беларускай мовы. У штомесячным часопісе «Наш край» рэгулярна друкаваліся метадычныя рэкамендацыі і інструкцыі, а таксама прамежкавыя вынікі сумеснай дзейнасці краязнаўцаў і навукоўцаў.

Уражваюць арганізацыйныя аспекты працы над будучым слоўнікам. Так, у чэрвені 1928 г., калі быў сабраны дастатковы матэрыял, было пастаноўлена прыступіць да работы над лексікаграфічным выданнем. Пачаўся адбор лексічных адзінак на літару «А» і падрыхтоўка праекта слоўніка. У часопісе «Наш край» адзначалася, што ўжо 15 красавіка 1929 г., праз 10 месяцаў, быў разгледжаны праект слоўніка, папраўлены, надрукаваны і адпраўлены спецыялістам. А першы аркуш «Слоўніка жывой беларускай мовы» на літару «А» для абмеркавання і разгляду членам рэдакцыйнай камісіі быў падрыхтаваны да сакавіка 1930 г. Усё гэта сведчыць пра небывалы энтузіязм выканаўцаў, іх вялікую зацікаўленасць у працы, усведамленне яе важнасці і неабходнасці.

У сувязі з драматычнымі падзеямі тых часоў слоўнік не быў падрыхтаваны і застаўся грандыёзным праектам беларускай нацыянальнай лексікаграфіі. На вялікі жаль, у полымі Вялікай Айчыннай вайны згарэла створаная для слоўніка жывой беларускай мовы картатэка, якая складала каля 400.000 тысяч картак-слоў.

Перакладныя слоўнікі С. Некрашэвіча і М. Байкова з'явіліся важным этапам у гісторыі нацыянальнай лексікаграфіі і да выхаду «Русско-белорусского словаря» (1953) пад рэдакцыяй Я. Коласа, К. Крапівы і П. Глебкі і «Беларуска-рускага слоўніка» (1962) пад рэдакцыяй К. Крапівы заставаліся найбольш грунтоўнымі працамі гэтага тыпу.

Сапраўды, кожнае лексікаграфічнае выданне мае выразныя прыкметы часу, у якім было створана, і нясе на сабе адбітак асоб, якія займаліся лексікаграфічнай практыкай. Аднак універсальнасць і ўсеагульнасць некаторых лексікаграфічных прынцыпаў, а таксама наяўнасць аднаго і таго ж аб'екта навуковага апісання – беларускай мовы, дазваляе канстатаваць пэўную бесперапыннасць лексікаграфічнага працэсу.

Сучасныя мовазнаўцы з удзячнасцю звяртаюцца да выданняў, падрыхтаваных слоўнікавай камісіяй Інбелкульта як пры ўкладанні перакладных і дыялектных слоўнікаў, так і пры распрацоўцы новага шматтомнага тлумачальнага слоўніка беларускай мовы, праца над якім вядзецца ў аддзеле лексікалогіі і лексікаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа.

Тамара МАРАКУЛІНА,
навуковы супрацоўнік аддзела
лексікалогіі і лексікаграфіі
Інстытута мовазнаўства
імя Я. Коласа

Фота С. Дубовіка, «Навука»

ЛАБАРАТОРЫЯ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ

Пад такой назвай у філіяле «Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа» Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі адбылася сустрэча вучоных са студэнтамі факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя Максіма Танка.



Будучыя настаўнікі пачатковых класаў выявілі жаданне падрабязней даведацца пра адметнасці працы па стварэнні слоўнікаў розных тыпаў пасля лекцыі на адпаведную тэму на занятках па беларускай мове. На прапанову загадчыка кафедры беларускага і рускага мовазнаўства Алены Васілеўскай аб правядзенні сустрэчы адгукнуліся супрацоўнікі інстытута: яны падрыхтавалі змястоўныя і пазнавальныя паведамленні, прэзентацыі, разам з бібліятэкарам Ірынай Смірновай арганізавалі выставу слоўнікаў.

Дырэктар Інстытута мовазнаўства Ігар Капылоў расказаў пра станаўленне, сучасны стан і напрамкі развіцця лексікаграфічнай дзейнасці ў акадэмічнай установе, пазнаёміў з такімі выданнямі, як «Граматычны слоўнік назоўніка», «Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы», «Слоўнік мовы Сенненшчыны», «Полацкія дыяменты», «Беларуска-рускі слоўнік», «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы», «Слоўнік мовы «Нашай нівы», «Кітайска-беларускі слоўнік. Беларуска-кітайскі слоўнік» і інш. Таксама Ігар Лявонавіч засяродзіў увагу прысутных на значэнні Інстытута беларускай культуры і дзейнасці яго заснавальнікаў для айчыннай гуманітарыстыкі, анансаваў мерапрыемствы, прымеркаваныя да 100-годдзя Інбелкульта, якія будуць сёлета праводзіцца ў НАН Беларусі.

Аўтар гэтых радкоў прадставіла ўдзельнікам сустрэчы фундаментальны «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» (**на фота**), на прыкладах паказала яго навуковую, сацыяльную і практычную вартасць, назвала этапы стварэння: фарміраванне крыніц – тэкстаў, напісаных на старабеларускай мове, іх выяўленне і пошук у айчынных і замежных бібліятэках і архівах, галоўным чынам Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Польшчы, падрыхтоўка іх фотакопій і мікрафільмаў, іх расчытванне, выпісванне слоў і сказаў, у якіх яны ўжываліся, на асобныя карткі, упарадкаванне картак (іх колькасць 1 мільён 60 тысяч).

Загадчык сектара корпуснай лінгвістыкі Уладзімір Кошчанка расказаў пра структуру Нацыянальнага корпуса беларускай мовы (Беларускі N-корпус), яго ролю ў аптымізацыі навуковых даследаванняў, прафесійнай дзейнасці рэдактараў, настаўнікаў, у вывучэнні беларускай мовы; прэзентаваў праграму «SloŭnikPlus», пры дапамозе якой укладаецца новы «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы»; а таксама падкрэсліў значнасць «Граматычнай базы» – збору слоў, у тым ліку і тых, што з'явіліся ў беларускай мове ў апошнія дзесяцігоддзі, з марфалагічнымі і іншымі паметамі.

Загадчык аддзела лексікалогіі і лексікаграфіі Алена Лапцёнак сваё выступленне прысвяціла новаму «Тлумачальнаму слоўніку беларускай мовы». Пры распрацоўцы падыходаў да лексікаграфавання слоўнага матэрыялу, як адзначыла Алена Мікалаеўна, былі ўлічаны вопыт папярэдніх і найноўшыя патрабаванні лексікаграфічнай тэорыі і практыкі, што дазволіць максімальна поўна адлюстраваць сістэму значэнняў беларускага слова, асаблівасці яго ўжывання ў розных стылях і жанрах. Мяркуецца, што ў тамах тлумачальнага слоўніка будзе прадстаўлена лексікаграфічнае апісанне звыш 250 тысяч слоў беларускай мовы ад пачатку XX ст. да нашых дзён (у тым ліку лексічных інавацый (аграгарадок), слоў, якія раней пазначаліся як экзатызмы (спікер), семантычных неалагізмаў (слімак) і інш.).

Падобныя сустрэчы мяркуецца ў перспектыве працягваць, паколькі яны, з аднаго боку, садзейнічаюць фарміраванню і ўдасканаленню прафесійнай кампетэнцыі будучых педагогаў, а з другога – дазваляюць папулярызаваць дасягненні і напрацоўкі акадэмічных вучоных-мовазнаўцаў.

Наталля ПАЛЯШЧУК,
Інстытут мовазнаўства
НАН Беларусі

Фота М. Гулякевіча, «Навука»

ЭКСПЕДИЦИЯ НА ПОЛЕСЬЕ

Ученые Института радиобиологии НАН Беларуси вместе с российскими коллегами изучают отдаленные радиоэкологические последствия чернобыльской аварии.



Состоялась совместная научная экспедиция лаборатории радиоэкологии Института радиобиологии НАН Беларуси, лаборатории дозиметрии и радиоактивности окружающей среды кафедры радиохимии химического факультета МГУ, НИИ ядерной физики им. Д.В. Скобельцына МГУ и ГЕОХИ РАН в Полесский государственный радиационно-экологический заповедник.

В ходе экспедиции отобраны образцы почвы и растений для последующего исследования поведения трансурановых элементов и топливных частиц на этапе отдаленных радиоэкологических последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС. Проведено радиометрическое обследование ряда участков с целью выявления характера распределения выпадений топливных элементов на территории зоны отчуждения. Осуществлено межлабораторное сличение результатов спектрометрического обследования территории *in situ*.

По информации Института радиобиологии НАН Беларуси

ВЗГЛЯД НА РАДОН

Новые направления поиска эффективных противораковых препаратов, в том числе и с использованием достижений радиационной медицины, – актуальны и востребованы.

С целью терапевтического уничтожения онкологических новообразований обычно применяют химиотерапию или лучевую терапию, а в изотопной медицине – вводят в опухоль соответствующие короткоживущие радионуклиды, например ^{59}Fe, ^{90}Y, ^{95}Zr, ^{99}mTc, ^{106}Ru, ^{114*}In, ^{147}Eu, ^{148}Eu, ^{155}Eu, ^{170}Tm, ^{188}Re, ^{210}Po, ^{222}Rn, ^{230}U, ^{237}Pu, ^{240}Cm, ^{241}Cm, ^{253}Es. Еще один метод – бинарная или нейтронозахватная технология, разработанная для избирательного воздействия на злокачественные новообразования и использующая тропные (т. е. накапливаемые именно в опухоли препараты, содержащие нерадиоактивные нуклиды – ^{10}B, ^{113}Cd, ^{157}Gd и др., которые активируют тепловым нейтронным излучением). А в последние годы идут активные поиски в области разработки уже триадной терапии – последовательного введения в организм комбинации из двух и более по отдельности неактивных и безвредных компонентов, но тропных к опухолевым тканям и способных в них селективно накапливаться или вступать друг с другом в химическое взаимодействие и уничтожать опухолевые новообразования под действием определенных сенсибилизирующих внешних воздействий.



Одним из перспективных направлений борьбы со злокачественными новообразованиями может быть использование радиоактивного короткоживущего природного изотопа радона, инкапсулированного во внутреннюю полость фуллеренола, ковалентно связанного с биоактивными компонентами (фрагментами аминокислот, пептидов, стероидных гормонов, нуклеиновых оснований или гетероциклических соединений, способных накапливаться именно в опухолевых, а не в здоровых и неповрежденных тканях организма). Изотоп радона (^{222}Rn), имеющий период полураспада всего около 3,8 суток, при самопроизвольном радиоактивном распаде испускает альфа-частицы с энергией 5,6 мегаэлектронвольт, которые и должны уничтожать раковые клетки опухоли.

Сырьевой базой для получения чистого радона могут служить грунтовые воды радоновых источников. В Беларуси на таких источниках, расположенных в Дятловском районе Гродненской области, еще с начала 1980-х годов действуют санатории «Радон» и «Альфа Радон», использующие радоновые ванны для облегчения хронических заболеваний, боли и усталости.

Для введения (интеркаляции) атомов радона во внутреннюю полость фуллереновой сферы могут быть применены технологии использования высоких и сверхвысоких давлений (вплоть до 400 тыс. атмосфер или более). При подобных воздействиях вандерваальсовы радиусы атомов уменьшаются на 30–40% и атомы радона должны легко впрессоваться во внутрь фуллерена.

Работы по моделированию такого рода соединений и поиску наиболее оптимальных путей и методов их получения ведутся в Институте физико-органической химии НАН Беларуси в лаборатории химии гетероциклических соединений (заведующий – член-корреспондент Владимир Поткин) в рамках программы «Конвергенция–2025». В решении этой комплексной задачи принимает участие коллектив ученых из ряда профильных научных учреждений: Института физики им. Б.И. Степанова, НПЦ по материаловедению НАН Беларуси, Института ядерных проблем БГУ, Объединенного института энергетических и ядерных исследований – Сосны и ВГМУ.

Евгений ДИКУСАР,
ИФОХ НАН Беларуси

В МИРЕ ПАТЕНТОВ

ПЛОСКАЯ ТЕПЛОВАЯ ТРУБА

«Способ изготовления плоской тепловой трубы» (патент №23481). Автор: В.В. Мазюк. Заявитель и патентообладатель: Объединенный институт машиностроения НАН Беларуси.

Задача данного изобретения заключалась в повышении теплопередающих характеристик получаемой плоской тепловой трубы при сохранении высокой производительности и низкой стоимости процесса изготовления.

Она решена автором последовательным применением следующих операций. На внутренней поверхности круглой трубы формируют слой металлического порошка. Порошок спекают, получая слой порошковой капиллярной структуры, герметично закрывают один из торцов круглой трубы. Через другой торец производят вакуумирование круглой трубы и заполнение ее водой, объем которой равен внутреннему свободному объему изготавливаемой плоской трубы. Далее осуществляют плющение круглой трубы до образования плоского корпуса. Через один из торцов удаляют воду, вакуумируют плоский корпус, заправляют его теплоносителем и герметизируют.

МАШИНА ДЛЯ РАЗГРУЗКИ РУДЫ

«Машина для разгрузки подземного склада руды» (патент №23451). Авторы: член-корреспондент НАН Беларуси В.Я. Прушак, В.Д. Михаленя, М.В. Скребец. Заявитель и патентообладатель: ЗАО «Солигорский институт проблем ресурсосбережения с опытным производством».

Известна машина для загрузки подземного склада руды, предназначенная для рыхления и погрузки калийной руды на проложенный вдоль склада конвейер. Недостатком конструкции такой машины является низкая надежность узла сопряжения поворотной и хвостовой рам конвейера, в частности таких его элементов, как подвижные борта, что снижает надежность машины в целом.

Предложенная авторами машина для разгрузки изготовлена в вышеназванном институте и прошла испытания в условиях подземного склада калийной руды в ОАО «Беларуськалий». Проведение необходимой проверки и дальнейшей эксплуатации машины подтвердили высокую надежность узла сопряжения поворотной и хвостовой рам, а также машины в целом.

Подготовил Анатолий ПРИЩЕПОВ,
изобретатель, патентовед

ПАМЯЦІ ВОЛЬГІ ЛЯЎКО

26 кастрычніка 2021 г. абарвалася жыццё вядомага беларускага археолага, гісторыка, доктара гістарычных навук, прафесара, Заслужанага дзеяча навукі Беларусі, галоўнага навуковага супрацоўніка аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вольгі Мікалаеўны Ляўко.



Яна нарадзілася 21 мая 1947 г. у в. Астравок Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Больш чым 50 гадоў, пачынаючы з 1970 г., Вольга Мікалаеўна працавала ў Інстытуце гісторыі АН БССР: лабарантам, з 1974 па 1983 г. – малодшым навуковым супрацоўнікам, з 1983 па 2001 г. – старшым навуковым супрацоўнікам, з 2001 па 2005 г. – вядучым навуковым супрацоўнікам. З 2006 па 2020 г. яна ўзначальвала цэнтр гісторыі даіндустрыяльнага грамадства, а затым цэнтр археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

У 1983 г. Вольга Мікалаеўна абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Витебск XIV–XVIII вв. (по археологическим данным)», тым самым заклаўшы падмуркі для развіцця новага накірунку ў беларускай археалогіі – археалогіі Новага часу. У 2000 г. – доктарскую дысертацыю «Формирование и развитие территориально-административных центров северо-восточной Беларуси в IX–XVIII вв.».

Асноўная ўвага даследчыцы была скіравана на вывучэнне пытанняў айчыннай сярэдневяковай гісторыі і археалогіі, этна- і культурагенэзу славян, фарміравання і развіцця раннедзяржаўных структур, тэрытарыяльна-адміністратыўных утварэнняў IX–XVIII стст. Вялікі навуковы і арганізацыйны вопыт дазволіў ёй стаць аўтарам канцэпцыі і кіраўніком стварэння археалагічнай навукова-музейнай экспазіцыі ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі «Развіццё археалагічнай навукі ў НАН Беларусі» (2007 г.).

У 2016 г. праца В. Ляўко «Кардон – новы археалагічны комплекс эпохі вікінгаў (VIII–X стст.) ва Усходняй Еўропе» увайшла ў Топ–10 вынікаў дзейнасці вучоных НАН Беларусі ў галіне фундаментальных і прыкладных даследаванняў.

В. Ляўко – аўтар дзясяткаў манаграфій і соцен навуковых і энцыклапедычных артыкулаў. Сярод грунтоўных манаграфічных выданняў – «Средневековое гончарство северо-восточной Белоруссии» (1992.), «Средневековая Орша и ее округа» (1993), «Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: формирование и развитие» (2004), «Витебск» (2010), «Друцк» (2014) і інш.

За свае дасягненні яна неадназова ўзнагароджвалася Ганаровымі граматамі Прэзідыума НАН Беларусі, Міністэрстваў, абласных і раённых выканаўчых камітэтаў, ВАК Рэспублікі Беларусь. На дзяржаўным узроўні В. Ляўко за асабістыя поспехі ў вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны нашай краіны ўзнагароджана медалём «За трудовые заслуги» і званнем «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь» (2017).

Калектыў Інстытута гісторыі НАН Беларусі выказвае шчырыя спачуванні родным, сябрам, калегам Вольгі Мікалаеўны Ляўко.



ЗАЛАЦІСТЫЯ САЛОМКІ СНАПКІ

Брылі, куфры, бочкі і нават галоўныя вароты іканастаса ў праваслаўным храме – са звычайнай саломы нашы продкі стваралі сапраўдныя ўзоры мастацтва. Гэтаму ўніверсальнаму прыроднаму матэрыялу прысвечана кніга «Залацістыя саломкі снапкі», якая выйшла ў Выдавецкім доме «Беларуская навука». Аўтары навінкі – вядомы міфолаг, фалькларыст, краязнавец і літаратуразнавец, доктар філалагічных навук, прафесар Аляксей НЕНАДАВЕЦ і яго сын Ягор, навуковы супрацоўнік аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Мы пацікавіліся ў Аляксея Міхайлавіча, пра што дапытлівы чытач даведаецца з новага выдання.



– Як выкарыстоўвалі салому ў гаспадарцы старажытныя беларусы?

– Салома мела важнае значэнне ў жыцці нашых продкаў. Яна была найпрацейшым дахавым і будаўнічым матэрыялам, ацяпляльным рэчывам, служыла выгодным сродкам для плящення разнастайных гаспадарчых прылад і прадметаў. З яе плялі гладышкі ці набірушкі для лясных ягад, майстравалі скрынкі як гаспадарчага прызначэння – набіраць тыя ж ягады, так і сявенькі – сеяць жыта. На саломе спалі – набівалі ёю матрацы, а калі нечакана прыязджалі госці і не было дзе ім пасла́ць, на падлогу высыпалі некалькі саламяных кулёў, якія служылі ложкам.

Мая радзіма – вёска Чухава Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. У нас на Палессі ў 1920–1930 гады салому выкарыстоўвалі для будаўніцтва мазанак, накшталт украінскіх. Яе здрабнялі, змешвалі з глінай і з атрыманага матэрыялу рабілі блокі, выводзілі сцены. Такім спосабам пабудаваў хату родны брат маёй бабулі – будынина стаіць на Піншчыне і сёння, яна ў выдатным стане.

Салому ў якасці сечкі традыцыйна дабаўлялі ў кармы хатняй жывёле. Яе разам з аўсянай мякінай запарвалі не толькі каровам ці авечкам, але і свінням: перамешвалі з бульбай – спадзяваліся, што такім чынам сала будзе бялейшым.

– Дзе збіралі матэрыял для кнігі?

– Ён быў назапашаны даўно. Большая частка – асабісты досвед. Выразна памятаю, як мяне, малога, мама брала з сабою на жніво. У сёмым класе школы мне даводзілася працаваць на сціртоўцы. Вельмі хораша і ўмела вырабляў з саломы разнастайныя рэчы мой бацька, які працаваў у калгасе трактарыстам. Ён быў майстравіты, з саломы плёў брылі, альбо капелюшы, рабіў вялікія балеі накшталт кошыкаў, у якія мы збіралі багаты ўраджай вішань. Дагэтуль у мяне захоўваюцца зробленыя бацькам саламяныя скрыначкі і сплецены гладыш.



У напісанні кнігі дапамаглі экспедыцыі – я ездзіў па рэспубліцы, часцей па Гомельскім і Брэсцкім Палессі. Праца змяшчае больш за 250 старонак. У ёй аналізуецца, як змяняліся адносіны вяскоўцаў да гэтага матэрыялу. Прыводзяцца шматлікія сведчанні этнографаў і фалькларыстаў, літаратараў і вяскоўцаў, звязаныя з працэсам сяўбы, жніва і малацьбы. Мае бацька і дзед перад тым як кінуць першае зерне ў зямлю абавязкова хрысціліся. Нядобразычлівыя людзі часам на зло гаспадару рабілі ў жыце завіткі ці заломы, спадзеючыся, што такім чынам нашкодзяць чалавеку. Памятаю, як мой дзед вырываў такія заломы з нашага поля. А некаторыя, каб пазбавіцца ад гэтых чар, запрашалі знахара, бо самі вырываць баяліся: верылі, што іх можа «скруціць».

– Якія ўнікальныя саламяныя вырабы з'яўляліся з-пад умелых рук сялянскіх майстроў?

– Напрыклад, саламяныя Царскія вароты – рэдкі артэфакт. Захаваліся такія ўзоры мастацтва з вёсак Лемяшэвічы і Дабраслаўка Пінскага раёна, якія знаходзяцца ў Музеі старажытнабеларускай культуры Цэнтра навуковых даследаванняў беларускай культуры і літаратуры НАН Беларусі. Іх спялі гадоў 200 таму. Калі пабачыць гэта хараство, мяняецца ўяўленне пра салому – гэта не проста падручны матэрыял.

З саломы рабілі вялізныя бочкі для захавання збожжа – такі экзэмпляр, прывезены з паўднёвага захаду Гомельшчыны, таксама захоўваецца ў акадэмічным музеі. Для Брэсцкага Палесся характэрны саламяныя куфры ці куфэркі.

У нашай і ў суседняй вёсцы жылі ўмельцы, якія выплялі высокамастацкія палукашкі з саломы на заднюю спінку воза – такому аздабленню ўсе дзівіліся. Некаторыя майстры рабілі палукашкі з лазы, але тыя былі грубаватыя, не такія прыгожыя, як з саломы. Нават пан з суседняй вёскі купіў у мужыка такі палукашак дзеля ўпрыгажэння сваёй брычкі.

Вынаходлівыя вяскоўцы плялі саламяны абутак накшталт валёнак, які надзявалі зверху на асноўныя чаравікі. Такія саламяныя боты асабліва былі зручнымі на балоце. У мароз іх аблівалі вадою, яны ледзянелі, і ўжо ні вецер, ні вада не былі для іх небяспечнымі.

У мінулыя часы з саломы здольныя людзі маглі зрабіць практычна ўсё. Існалі свае сакрэты. Прычым салома для рукадзелля павінна быць абавязкова жытнёвай. Аўсяная, пшанічная – мяккая, яна хутка патрэцца і распадзецца. Ачышчаную ад сцябліны салому замочвалі ў кіпені ці запарвалі ў печы, яна станавілася бліскучага залацістага колеру, для большай надзейнасці і моцнасці будучай рэчы мой бацька пераплятаў яе распалавіненымі ўдоўж, абчасанымі лазовымі дубцамі. Нярэдка я яму дапамагаў…

Гутарыла Алена ПАШКЕВІЧ, «Навука»

УПОР – НА ГЕНОФОНД ОТЕЧЕСТВЕННЫХ ПОРОД

В НПЦ по животноводству в режиме on-line состоялась XXVIII Международная научно-практическая конференция «Инновационный путь развития свиноводства стран СНГ», посвященная памяти выдающегося ученого-агрария, доктора сельскохозяйственных наук, профессора, члена-корреспондента НАН Беларуси Василия Михайловича Голушко.

Конференцию открыл первый заместитель генерального директора Центра Иван Шейко. Он обозначил проблемы, стоящие перед белорусским свиноводством (в частности, в племенном деле), определил пути их преодоления и особо подчеркнул, что белорусское свиноводство может динамично развиваться только на генофонде отечественных пород.

Руководитель научного направления «Селекция, разведение и информационное обеспечение в свиноводстве» ВНИИ племенного дела (Россия) Алексей Новиков в своем докладе остановился на селекционном отборе животных свиней крупной белой породы на базе опытного хозяйства методом оценки BLUP.



Ученые из Брянского государственного аграрного университета поделились своим видением решения проблем в области кормления свиней. В частности, профессор кафедры кормления животных, частной зоотехнии и переработки продуктов животноводства Леонид Гамко обратил внимание на влияние сывороточно-минерально-витаминной добавки на продуктивность и качество мясной продукции при скармливании в рационах молодняка свиней. А доктор сельскохозяйственных наук Анна Менякина рассказала о применении в кормлении поросят-отъемышей цеолитпробиотической добавки.

Зав. кафедрой кормления и разведения сельскохозяйственных животных БГСХА Иван Серяков осветил проблему витаминизации в кормлении свиней. К слову, данное научное направление он развивал, сотрудничая с Василием Голушко. Продолжением данного доклада стало сообщение зав. лабораторией кормления свиней НПЦ по животноводству Сергея Линкевича об использовании комплексного минерально-энзиматического концентрата на основе трепела в рационах молодняка свиней.

О белковом концентрате ячменного солода как новой перспективной добавке для комбикормов престартеров и стартеров для свиней рассказал зав. отделом кормления физиологии питания и кормопроизводства Института животноводства НААН Украины Леонид Подобед. Он подчеркнул необходимость использования вторичных продуктов переработки в кормлении сельскохозяйственных животных, поскольку это не только обогащает рационы питательными веществами, но и экономит финансовые затраты на приобретение дорогостоящих кормовых добавок.

Зав. лабораторией технологии содержания свиней и зоогигиены НПЦ по животноводству Дмитрий Ходосовский рассказал о необходимости мониторинга параметров микроклимата при содержании молодняка свиней на откорме с целью получения свинины высокого качества.

Инна ГАРМЕЛЬ, фото С. Дубовика, «Навука»

НАВУКА
www.gazeta-navuka.by
Заснавальнік: Нацыянальная акадэмія навук Беларусі
Выдавец: РУП «Выдавецкі дом «БЕЛАРУСКАЯ НАВУКА»
Індэксы: 63315, 633152. Рэгістрацыйны нумар 389. Тыраж 833 экз. Зак. 1414

Фармат: 60 × 84 1/4
Аб'ём: 2,3 ул.-выд. арк., 2 д. арк.
Падпісана да друку: 29.10.2021 г.
Кошт дагаворны
Надрукавана:
РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»,
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
Пр-т Незалежнасці, 79/1, 220013, Мінск

Галоўны рэдактар
Сяргей Уладзіміравіч ДУБОВІК
тэл.: 379-24-51

Рэдакцыя:
220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, пакоі 122, 124.
Тэл./ф.: 379-16-12
E-mail: vedey@tut.by

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.
Пры передруку спасылка на «НАВУКУ» абавязковая.
Аўтары апублікаваных у газеце матэрыялаў нясуць адказнасць за іх дакладнасць і гарантуюць адсутнасць звестак, якія складаюць дзяржаўную тайну.

ISSN 1819-1444

